***К. Э. Сівуха***

*Навуковы кіраўнік*
***А. М. Аксёнаў***

*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай каапераціі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# БЕЛАРУСКІ РУЧНІК: ГІСТОРЫЯ, ТРАДЫЦЫІ, РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

У традыцыйнай творчасці беларусаў ёсць цікавае і таямнічае рамяство – ткацтва. Ткацтва лічыцца адным з старажытнейшых рамёстваў у гісторыі чалавецтва. Яно ўзнікла ў неаліце і пашырылася ў перыяд першабытнага ладу. У краінах антычнага свету ў ткацтве шырока выкарыстоўваліся лён, бавоўна, шэрсць, шоўк.

Яшчэ зусім нядаўна ўменне ткаць было абавязковым для кожнай сялянкі, і недарэмна асноўную частку пасагу дзяўчыны, што выходзіла замуж, павінны былі складаць тканыя вырабы: адзенне, пасцель, ручнікі, абрусы і інш.

Спосабаў ткацтва вядома шмат: звычайнае палатнянае перапляценне, браная (пераборная) тэхніка, закладная, шматнітовая і інш.

Па ўсёй Беларусі і за яе межамі для гэтага скарыстоўваецца самаробны стан – кросны. Ніткі, якія ўтвараюць аснову, спецыяльным прыстасаваннем (рамізкамі, нітамі) разбіраюцца на дзве часткі – верхнюю і ніжнюю, якія пры дапамозе падножак увесь час мяняюцца месцамі. Між імі прапускаецца папярочная нітка-ўток і прыбіваецца прыладай у выглядзе густога грэбеня – бёрдам. Па чарзе прапускаючы ўправа-ўлева ўток і перамяжаючы верхнюю і ніжнюю паловы асновы, майстрыха тчэ доўгі сувой палатна або нейкі дэкаратыўна-мастацкі выраб. Для апошніх ільняную ці шарсцяную пражу – асноўныя ў Беларусі матэрыялы для ткацтва – фарбавалі ў натуральных фарбавальніках з кветак, кары дрэў, траў і інш. Яркіх колераў яны не давалі, таму традыцыйная гама беларускіх тканых вырабаў стрыманая, пераважаюць белыя ці бела-шэрыя тканіны з пяшчотным малюнкам, які ўтвараецца чаргаваннем адбеленых і неадбеленых (суравых) нітак.

Шмат стагоддзяў карыстаюцца беларусы ручніком. Ткуць і расшываюць яго і сёння. Ручнікі ўжываліся для штодзеннага і святочнага ўбрання жылля і абразоў, у вяселлях і пахаваннях. Ручнікі ўваходзілі ў пасаг нявесты, з’яўляліся неабходнай часткай падарункаў нявесты жаніху, сватам, родзічам жаніха. Ручнікі перавязвалі цераз плячо важнейшых удзельнікаў вяселля. Іх пасцілалі як «падножнік», на які станавіліся маладыя ў час царкоўнага вянчання, выкарыстоўвалі для абгортвання рук нявесты і жаніха ва ўрачыстыя моманты вяселля.

На ручніку што ні ўзор, то сімвал. Арнамент беларускіх традыцыйных тканін – гэта жаночая мова, якая за доўгі перыяд свайго функцыянавання ўвабрала ў сябе значэнні і сэнсы слоў і сказаў рознага па часу паходжання.

Усё, што захавана ў народным ткацтве, цяжка пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў і каханне, гонар за чалавека і яго працу, кожны ўзор мае сваё прызначэнне і сваю назву.

Паглыбляючыся ў славянскую язычніцкую старажытнасць, можна адшукаць гістарычна-культурныя карані і вытокі першапачатковай сімволікі ручніка, які паўстае перад намі ў незлічонай мастацкай разнастайнасці ўзораў канца XIX–XX ст.ст.

Васьміпялёсткавая разетка (Спарыш) – сімвал добрага ўраджаю. Посцілкі з узорам ураджаю бываюць, як правіла, вельмі дэкаратыўныя. Яркія сакавітыя фарбы радуюць, ствараюць настрой аптымізму і надзеі. Сімвал жыцця скампанаваны з дзвюх частак: ромб з адросткамі-прамянямі – Сонца, такі ж ромб з прамянямі, накіраванымі ўнутр, – Зямля. Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця, сімвал Сонца змяшчаецца ў сімвал Зямлі. Як вядома, у народзе голуб і галубка лічацца сімвалам кахання. У арнаменце ручнікоў часта сустракаюцца гэтыя матывы.

У ручніку адчуваецца подых аддаленых эпох, свядомасць і звычаі колішніх пакаленняў. З даўніх часоў бяруць пачатак паважлівыя адносіны да тканіны, арнаменту гэтага незвычайнага прадмета, які нібы ланцугом звязваў розныя часткі абраду і сваёй прысутнасцю аб’ядноўваў сямейную, каляндарную звычаёвасць. У ім адлюстроўваюцца пэўнае асэнсаванне рэчаіснасці, мадэль свету, якой доўгі час карысталіся нашы продкі.

Так стварaўся ручнік – выраб калектыўнай працы і індывідуальнага імкнення, традыцыйнага і заўсёды новага мастацтва. І кожны раз – як у далёкім мінулым, так і сёння – ткачыха, беручыся за справу, спадзявалася, што палатно атрымаецца не горшае, чым у людзей, а калі ўдасца, то і крыху

лепшае. Папрактыкавацца ж, удасканаліць сваё майстэрства і густ было на чым, бо ручнікоў патрабавалася шмат.

Трэба рабіць усё, каб выявіць, сабраць, зберагчы тыя ўзоры народнай мастацкай творчасці, якія яшчэ захоўваюцца ў традыцыйным побыце. У бягучым 2016 годзе, аб’яўленым у Беларусі Годам культуры, цікавасць да беларускай традыцыі ткацтва, як важнай складаючай нацыянальнай культуры, мае асаблівае значэнне.